ния и культуры, принципов рационального отношения к окружающей среде для достижения экологической безопасности и руководствования ими в профессиональной деятельности. В таких условиях большинство студентов понимают возрастающую роль экологических знаний в сознании населяющих планету людей.

1. Социальная работа : учеб.-метод. комплекс для студентов очной и заочной форм обучения фак. социальной педагогики и психологии / [сост.: А. П. Орлова [и др.] ; под общ. ред. А. П. Орловой] ; М-во образования РБ, УО "Витебский гос. ун-т им. П. М. Машерова". – Витебск : Изд-во УО "ВГУ им. П. М. Машерова", 2006. – 198 с. URL: https://rep.vsu.by/handle/123456789/2586 дата обращения: 19.01.2023).

2. Социальная практика Союзного государства : энциклопедия / [сост. Е. Л. Михайлова, Т. Д. Вакушенко, С. Д. Матюшкова] ; М-во образования Республики Беларусь, Учреждение образования "Витебский государственный университет имени П. М. Машерова", Каф. социально-педагогической работы. – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2022. – 171, [1] с. URL: https://rep.vsu.by/handle/123456789/36215 (дата обращения: 19.01.2023).

# АРГАНІЗАЦЫЯ КАНТРАЛЯВАНАЙ САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ СТУДЭНТАЎ ПРЫ ВЫКЛАДАННІ ДЫСЦЫПЛІНЫ “ЭКАНОМІКА-КІРАЎНІЦКІЯ АСНОВЫ САЦЫЯЛЬНАЙ РАБОТЫ”

*С.І. Міхайлаў*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Разам з лекцыйнай часткай вучэбнай дысцыпліны, правядзеннем семінарскіх заняткаў, выніковымі формамі кантролю ведаў, важнае месца ў сістэме засваення вучэбнага матэрыялу займае самастойная кіраваная і кантраляваная праца студэнтаў. Гэты метадычна важны блок заданняў знаходзіць сваё безумоўнае адлюстраванне і ў структуры пабудовы вучэбна-метадычнага комплекса (ВМК) па дысцыпліне “Эканоміка-кіраўніцкія асновы сацыяльнай работы”, які змяшчае ўсе неабходныя для вывучэння дысцыпліны матэрыялы [1]. “Бягучая дыягностыка кампетэнцый студэнтаў ажыццяўляецца шляхам вуснага і пісьмовага кантролю ведаў і ўменняў на занятках, выканання індывідуальных заданняў, падрыхтоўкі рэфератаў, прэзентацый, лекцый і бясед, індывідуальнага сумоўя” [1, с. 5–6]. У працэсе вывучэння дысцыпліны студэнты павінны авалодаць прыёмамі аналізу эканамічных праблем і іх уплыву на сацыяльны дабрабыт грамадства, сфарміраваць сістэмны падыход да вывучэння эканамічных законаў, сістэмы кіравання сацыяльнай работай, замацаваць атрыманыя веды на практыцы пры дапамозе выканання творчых заданняў, павысіць узровень прафесійнай кампетэнтнасці. І ў гэтым, натуральна, важная роля адводзіцца самастойнай кіраванай і кантраляванай працы студэнтаў.

Мэта нашага даследавання – вывучыць існуючыя тэарэтычныя падыходы і практычныя магчымасці да праектавання заданняў для кіраванай самастойнай працы студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне “Эканоміка-кіраўніцкія асновы сацыяльнай работы”.

**Матэрыялы і метады.** Сістэматызаваны віды самастойнай кіраванай і кантраляванай працы студэнтаў, прымяненне якіх мэтазгодна пры арганізацыі эфектыўнай самастойнай працы студэнтаў у працэсе вывучэння дысцыплін сацыяльна-эканамічнага плана, а таксама прадстаўлены асобныя аўтарскія напрацоўкі па праектаванні і прымяненні заданняў螺 рознага ўзроўню пры вывучэнні дысцыпліны “Эканоміка-кіраўніцкія асновы сацыяльнай работы”.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** На сучасным этапе развіцця адукацыі “якасна змяняецца пазіцыя студэнтаў у адукацыйным працэсе. З’яўляецца магчымасць і неабходнасць індывідуалізацыі прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў. Гэта патрабуе пабудовы індывідуальнай адукацыйнай траекторыі студэнта” [2, с.110]. Існуюць разнастайныя падыходы да класіфікацыі відаў вучэбных заданняў, што выкарыстоўваюцца для самастойнай кіраванай працы студэнтаў. У прыватнасці, І.А. Новік (2003), зыходзячы з наяўнасці двух відаў разумовай самастойнасці (адлюстравальна-ўзнаўляльнай і адлюстравальна творчай), выдзяляе наступныя віды самастойных заданняў: праца па ўзоры, рэканструктыўна-варыятыўныя, часткова-пазнавальныя і даследчыя заданні. Намі пры праектаванні і арганізацыі самастойнай кіраванай і кантраляванай працы студэнтаў у працэсе вывучэння дысцыпліны “Эканоміка-кіраўніцкія асновы сацыяльнай работы” прымяняюцца наступныя віды заданняў:

– *рашэнне сацыяльна-эканамічных задач па ўзоры* (з выкарыстаннем пэўнага алгарытму). Гэта могуць быць задачы на вылічэнне памераў пенсій розных відаў, велічыні сацыяльных адлічэнняў у Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва, памераў сацыяльных выплат, дапамог і г.д.;

– *напісанне рэфератаў на сацыяльна-эканамічную тэматыку* (напрыклад, “Гістарычныя ўмовы развіцця сістэмы сацыяльнай абароны найбольш уразлівых пластоў грамадства”, “Сістэма сацыяльнага забеспячэння ў Рэспубліцы Беларусь” і г.д.);

– *напісанне сацыяльна-эканамічных эсэ.* Як правіла, прысутнічае праблемны характар тэматыкі з неадназначнасцю інтэрпрэтацыі і трактоўкі (напрыклад, “Сацыяльная арыентацыя беларускай мадэлі эканомікі”, “Праблема арганізацыі працоўнай дзейнасці не занятых ў эканоміцы грамадзян” і г.д.);

– *праца з перыядычнай сацыяльна-эканамічнай літаратурай.* Напрыклад: а) зрабіць копію артыкула, які датычыцца эканамічных асноў сацыяльнай работы (сістэмы льгот, сацыяльных дапамог, выплат, сацыяльна-эканамічных аспектаў працоўнай, адукацыйнай, медычнай сфер, аказання сацыяльных паслуг насельніцтву); б) вывучыць яго і скласці сціслы план; в) выпісаць асноўныя сацыяльна-эканамічныя тэрміны (паняцці) і знайсці іх азначэнне ў “Эканамічным слоўніку”, “Энцыклапедыі сацыяльнай работы”;

– *распрацоўка студэнтамі сацыяльных праектаў* (напрыклад, «Платформа зносін і сумеснай занятасці асобных сацыяльна ўразлівых катэгорый грамадзян (маладыя інваліды, асобы з ліку дзяцей-сірот, дзеці з асаблівасцямі развіцця) ва ўмовах тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва”);

– *аналіз студэнтамі сацыяльнай праграмы, што дзейнічае (-ла) у Рэспубліцы Беларусь* (напрыклад, «Аб сацыяльнай абароне і садзейнічанні занятасці», «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека», «Адукацыя і моладзевая палітыка»), па зададзенай схеме: мэта і задачы праграмы, тэрміны рэалізацыі праграмы, асноўныя раздзелы праграмы, мерапрыемствы праграмы, рэсурснае забеспячэнне праграмы, чакаемыя вынікі праграмы;

– *аналіз студэнтамі фінансавай і статыстычнай дакументацыі ўстаноў сацыяльнай сферы* (напрыклад, тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва) з наступным стварэннем на іх падставе распрацовак аналітычнага і параўнальнага характару. Напрыклад, на падставе статыстычных і фінансавых даных ДУ «ТЦСАН Першамайскага раёна г.Віцебска» па відах і аб’ёме дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі падрыхтаваць рэкамендацыі па павышэнні эканамічнай і арганізацыйнай эфектыўнасці аказання сацыяльнай дапамогі ў дадзенай установе сацыяльнага абслугоўвання;

– *самастойная праца студэнтаў з нарматыўна-прававой дакументацыяй сацыяльных устаноў і службаў*. Напрыклад: прааналізаваць узоры статутаў, службовых інструкцый і палажэнняў аб падраздзяленні, вызначыць асноўны змест раздзелаў “Правы”, “Абавязкі”, “Адказнасць”, “Крытэрыі ацэнкі дзейнасці”, пабудаваць арганізацыйную структуру кіравання разнастайных устаноў сацыяльнай сферы, абгрунтаваць від кіравання, сістэму падпарадкавання;

– *самастойная распрацоўка студэнтамі міні-тэстаў па вывучанай тэме або праходжанне тэста, распрацаванага выкладчыкам.* Напрыклад, выберыце від сацыяльнай дапамогі, памер якой складае 14 бюджэтаў пражытковага мінімуму: а) дапамога на пахаванне; б) дапамога ў сувязі з нараджэннем першага дзіцяці; в) дапамога па доглядзе дзіцяці да трох гадоў; г) дапамога па доглядзе дзіцяці-інваліда; д) дапамога ў сувязі з нараджэннем другога дзіцяці;

– *стварэнне студэнтамі выніковых тэматычных прэзентацый у рэдактары PowerPoint* па вывучанай тэме, раздзеле (напрыклад, «Эканоміка-кіраўніцкія асновы пенсійнага забеспячэння ў Рэспубліцы Беларусь») альбо па тэме, што выносіцца на самастойнае вывучэнне;

– *разбор кіраўнічых сітуацый і знаходжанне аптымальнага рашэння*;

– *распрацоўка студэнтамі сацыяльных рэкламных улётак, праспектаў, калажаў для прасоўвання сацыяльных паслуг на рынку*.

**Заключэнне.** Кіраваная і кантраляваная самастойная праца студэнтаў спецыяльнасці 1-86 01 01 "Сацыяльная работа (па накірунках)" займае значнае месца ў працэсе вывучэння імі дысцыпліны "Эканоміка-кіраўніцкія асновы сацыяльнай работы". Пры праектаванні самастойнай працы студэнтаў важна імкнуцца да рознаўзроўневага характару прапанаваных заданняў з паступовым узрастаннем ступені іх складанасці ад тэарэтычна-ўзнаўляльнага ўзроўню да непасрэдна практычна-творчага.

1. Экономико-управленческие основы социальной работы для специальности 1-86 01 01 Социальная работа (по направлениям): учебно-методический комплекс по учебной дисциплине / С.И. Михайлов, Е.Л. Михайлова. – Витебск: ВГУ имени П.М. Машерова, 2017. – 135 с.URL: https://rep.vsu.by/handle/123456789/13036 (дата обращения:28.01.2023)

2. Орлова, А.П., Михайлова, Е.Л. Потенциальные возможности моделирования индивидуальной траектории профессионального становления будущего специалиста социальной сферы / А.П. Орлова, Е.Л. Михайлова // Веснік Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта. – 2012. – № 1 (67). – С. 110-115. URL: https://rep.vsu.by/handle/123456789/4242 (дата обращения:28.01.2023)

# ПРЕДСТАВЛЕНИЯ БУДУЩИХ СПЕЦИАЛИСТОВ СОЦИАЛЬНОЙ СФЕРЫ О ПРОФЕССИОНАЛЬНЫХ КОМПЕТЕНЦИЯХ, НЕОБХОДИМЫХ ДЛЯ РАБОТЫ В ПОЛИКУЛЬТУРНОМ СОЦИУМЕ

*Е.Л. Михайлова*
*Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова*

Профессиональная компетентность рассматривается как интегральная характеристика, определяющая способность разрешать профессиональные проблемы и типичные профессиональные задачи, возникающие в реальных ситуациях в профессиональной деятельности, использование знаний, профессионального и жизненного опыта, ценностей и склонностей. Она, безусловно, имеет деятельностный характер обобщенных умений, сочетающихся со знаниями и предметными умениями, приобретаемыми в период профессиональной подготовки специалиста. Собственно, профессиональная компетентность проявляется в умении специалиста осуществлять выбор, исходя из адекватной оценки себя и своих профессиональных возможностей в каждой конкретной ситуации, а для социальной сферы – и с каждым конкретным клиентом.

Профессиональная компетентность, в свою очередь, представлена совокупностью следующих компетенций: ключевых, связанных в обобщенном виде с профессиональной деятельностью; общих, способствующих систематизации полученных знаний и связи их с практической деятельностью; специальных, представляющих совокупность профессионально значимых качеств в конкретной профессиональной деятельности и обеспечивающих ее успешную реализацию. Понятие «компетенция» рассматривается ученым Е.В. Гелясиной как «заранее заданное социальное требование, предъявляемое к результатам образования (смысловым ориентациям, каче-